УДК 930

***Сувалаў Алег***
*Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь*

# ПОГЛЯДЫ Я. ЛЁСІКА НА ПРАБЛЕМУ ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ

У артыкуле разглядаюцца навуковыя погляды акадэміка Язэпа Лёсіка на праблему этнагенезу беларусаў. Паказваецца роля Я. Лёсіка ў фарміравнні поглядаў і падыходаў да асноўных праблем гісторыі беларусаў у савецкай гістарыяграфіі 20-х – пачатку 30-х гг. ХХ ст.

***Ключавыя словы: беларусы, этнас, гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя.***

Перыяд дзейнасці Язэпа Лёсіка ўяўляе сабой адзін з найбольш складаных для вывучэння этапаў у айчыннай гістарыяграфіі. Развал Расійскай імперыі, спробы аднаўлення беларускай дзяржаўнасці (БНР – ССРБ – ЛітБелССР – БССР), фарміраванне савецкай каманднаадміністрацыйнай сістэмы, барацьба з «нацдэмамі», рознага роду «ўхіламі» складаюць кантэкст палітычнай дзейнасці і навуковай творчасці савецкага акадэміка, які загінуў у выніку сталінскіх рэпрэсій.

Язэп Лёсік – адзін з дзеячоў першай паловы ХХ ст., чыё імя і навуковыя погляды доўгі час былі выкрэслены з гістарыяграфічных даследаванняў па ідэалагічных і палітычных падставах. Для савецкай гістарыяграфіі ён – адзін з удзельнікаў нацыянальнага руху, прыхільнік і кіраўнік Беларускай Народнай Рэспублікі, лідар Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, які скончыў сваё жыццё ў савецкай турме, не з'яўляўся асобаю чые навуковыя погляды варта было змяшчаць у навуковых даследаваннях і падручніках. Яго навуковая дзейнасць у айчыннай гістарыяграфіі працяглы час заставалася мала даследаванай па прычыне антысавецкага характару яго палітычнай дзейнасці.

Для нашага разгляду навуковы інтарэс прадстаўляюць яго даследаванні, якія ўтрымліваюць трактоўкі аўтара праблемы этнагенезу беларусаў. Таксама звернемся да прац перш за ўсё па беларусаму

мовазнаўству, паколькі мова – адзін з вызначальных пакажчыкаў існавання асобнага самастойнага этнаса.

Па-сутнасці яго навуковых поглядаў трэба сказаць наступнае. Я. Лёсік належыў да ліку тых даследчыкаў, хто разглядаў ВКЛ як складаючаю частку гісторыі Беларусі. Неабходна пагадзіцца са Зм. Санько, што Я. Лёсік быў адным з першых у беларускай гістарыяграфіі, хто ўзяў «пытанне назова «Літва», звязаўшы яго з характарам Вялікага Княства Літоўскага» [2, с. 5]. Інакш кажучы, Я. Лёсік разглядаў ВКЛ у якасці дзяржавы беларусаў, аднаго з этапаў дзяржаўнага развіцця Беларусі [2, с. 7]. Ён слушна акцэнтаваў увагу на тым, што «пад Літвою разумеюць землі, заселеныя жмудзінамі, або даўнейшую Жамойць», і што «слова Літва … ніяк ня можа азначаць цяперашніх літоўцаў» [2, с. 7]. У трактоўцы этнічнай гісторыі беларусаў Я. Лёсік звяртае ўвагу на тое, што Вільня «належыць да самых даўнейшых славянскіх сяліб» [2, с. 10]. У гэтым плане яго погляды супадаюць з пазнейшымі даследаваннямі Уладзіміра і Алены Галубовічаў. Апошнія ў міжваенны перыяд на аснове ахеалагічных матэрыялаў даказвалі, што першымі пасельнікамі на тэрыторыі г. Вільны былі менавіта славяне, якія на гары Алтарыя (яна ж Лысая, яна ж Крывая) заснавалі Крывы горад або Крывіч-горад (пазнейшая Вільня) [1, с. 116, 123–124]. Галубовічы выводзілі старую назву Вільні – Крывіч-горад, – ад імені яго першых пасельнікаў – крывічоў [1, с. 123]. Я. Лёсік жа без указання канкрэтных прозвішчаў вучоных указвае, што апошнія называюць першымі будаўнікамі гэтага гораду былі «славяне з племені Валоты (вількі, люцічы, люцікі=лютва, Літва?), аб каторых у II-м веку ўпамінае Птолёмей» [2, с. 10]. Ніжэй са спасылкаю на «Апісанне Барысаўскага павета» Я. П. Тышкевіча прыводзіцца даволі вялікая цытата з П. Й. Шафарыка ў падцвярджэнне знаходжання славянскага племені «валоты, валеці, вількі, або ваўкі ці *люцічы*», якія «сваёй сталіцы й рэчкам свае найменні пакінулі – Вільня, Вільля» [2, с. 14–15].

Адным з аргуметаў на карысць славнянскай прыроды старажытнай Літвы Я. Лёсік прыводзіць факт таго, што нібыта ўсе імёны князёў гэтай дзяржавы былі выключна славянскімі [2, с. 11–12]. Нагадаем, што падобная ідэя мелі месца ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі. Напрыклад, у канцы 80-х гг. XIX ст. Ул. Юргевіч апублікаваў артыкул «Вопыт тлумачэння імёнаў князёў літоўскіх», у якім выводзіў імёны вялікіх князёў літоўскіх са славянскіх моў [4].

Звяртаўся Я. Лёсік і да праблемы разумення паняцця «рускі» у айчыннай і замежных гістарыяграфіях. У старадаўні час самі беларусы ў перыяд ВКЛ называлі сабе рускімі, а цяперашніх велікарусаў (у тэрміналогіі Я. Лёсіка «расійцаў») – «маскоўцамі», «маскавітамі»,

«маскавіцянамі» [2, с. 13–14]. Дакладны час, калі апошнія пачалі выкарытоўваць этнонім «рускія» аўтар не вызначае, абмяжоўваючыся выслоў’ем «далёка пазней» [2, с. 14].

Язэп Юр’евіч быў перш за ўсё моваведам. Таму найбольшы інтарэс маюць яго погляды на час узнікнення, аснову і гісторыю развіцця беларускай мовы. Я. Лёсік лічыў, што сучасная беларуская літаратурная мова «ў шырокім значэньні» яшчэ не сфарміравалася (на 1924 г.)  [3, с. 194]. Асабіста ў яго яшчэ не быў канчаткова выпрацаваны паняційны апарат для вызначэння сучасных яму беларусаў і іх мовы. У выданнях, і нават у межах адной публікацыі, у яго сустракаюцца «беларусіны» [3, с. 197], «беларусіны (крывічане)» [3, с. 196], «крывічанская ці крывіцкая мова» [3, с. 193]. Старажытная літаратурная мова ў яго выступае як «старасьвецкая беларуская літаратурная мова» [3, с. 196].

Для нашага разгляду важнае месца мае невялікая па аб’ёму праца Я. Лёсіка «Літва-Беларусь: гістарычныя выведы», якая змяшчае ў сабе канцэптуальныя палажэнні нацыянальнай гісторыі Беларусі. Па-першае, гісторыя Беларусі бярэ свой пачатак не з часу, калі ўзнікае назва «Беларусь», або з часу ўтварэння дзяржавы з такім найменнем. Згодна з пазіцыяй Я. Лёсіка, гістарыя Беларусі, як і гісторыя беларусаў, генетычна звязаны са старажытным насельніцтвам гэтага рэгіёну.

Па-другое, ВКЛ разглядаецца даследчыкам як гістарычны этап развіцця Беларусі і беларускага народа. Адсюль траціцца падмурак вакол дыскусій аносна характару ўваходжання славянскіх зямель у склад гэтай дзяржавы (ВКЛ); губляецца неабходнаць тлумачыць якім чынам непараўнальна колькасна меньшы народ, які да гэтага ж знаходзіўся ва ўмовах знешняй агрэсіі з боку крыжакоў, змог сам распачаць захопніцкую экспансію на землі ўсходніх славян; чаму асноўная частка этнічнай тэрыторыі балтаў, – Жмудзь, – перадавалася правіцелямі ВКЛ, нібыта этнічнымі балтамі князямі Міндоўгам, Ягайлам і Вітаўтам крыжакам.

Я. Лёсік на прамую не казаў пра ўдзел балцкага насельніцтва ў этнагенезе беларусаў. Але яго разуменне ВКЛ як агульнай спадчыны як балтаў, гэтак і славян стварала падмурак для такой трактоўкі ў будучым. Канцэптуальна пастаноўка праблемы этнагенезу беларусаў у варыянце іх аўтахтоннасці і генетычнай непарыўнай сувязі са старажытным насельніцтвам рэгіёна здымала неабходнасць доказу іх этнічнай самастойнасці. Пры такой пастаноўцы пытанні вызначэння часу узнікнення пэўных этнічных асаблівасцей, а таксама фарміравання мовы і этнічай самасвядомасці, страчвалі сваю вастрыню і важ-

насць, паколькі ўяўляліся заканамернымі працэсамі, што працякалі на гэтых тэрыторыях са старажытных часоў. Таксама не такімі істотнымі станавіліся і пытанні ўзаемасувязі з велікарускім і ўкраінскім народамі, асабліва ў часцы вызначэння старшынства іх паходжання.

Значны разрыў па часе тлумачыцца сталінскімі рэпрэсіямі, ліквідацыяй значнай колькасці інтэлектуальнай эліты Беларусі ў канцы 20-х – 30-х гг. XX ст., несфарміраванасцю навуковых школ у беларускай савецкай гістарычнай навуцы ў гэты перыяд, а таксама недаступнасцю публікацый рэпрэсіраваных даследчыкаў для шырокай навуковай грамадскасці і недапушчальнасці выкарыстання прац «нацдэмаўскіх» аўтараў з мэтай іх уласна навуковага аналіза. Ідэалагічная крытыка і выкрыццё антыкласавай і антысавецкай сутнасці дапускаліся як правіла без указанняў канкрэтных прозвішчаў аўтараў, назваў іх твораў.

1. Голубович, В. Кривой город – Вильно / В. Голубович, Е. Голубович // Краткие сообщения Института истории материальной культуры. – Вып. 11. –М.-Л., 1945. – С. 114–125.
2. Лёсік, Я. Літва-Беларусь : гістарычныя выведы / Я. Лёсік. – Мінск : Тэхналогія, 2016. – 35 с.
3. Лёсік, Я. Некаторыя ўвагі да беларускае літаратурнае мовы / Я. Лёсік // Полымя. – 1924. – № 2 (10). – С. 192–205.
4. Юргевич, В. Н. Опыт объяснения имен князей литовских / В. Н. Юргевич. – Москва : в универ. тип., 1884. – 29 с.

## J. LESIK'S VIEWS ON THE PROBLEM OF THE ETHNOGENESIS OF BELARUSIANS

***Aleh Suvalau***
*Academy of the Ministry of Internal Affairs Of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus, suvalau@tut.by*

The article examines the scientific views of Academician Joseph Lesik on the problem of ethnogenesis of Belarusians. The role of J. Lesik in the formation of views and approaches to the main problems of the history of Belarusians in the Soviet historiography of the 20s and early 30s of the XXth century is shown.

***Keywords: Belarusians, ethnos, historiography, ethnogenesis, ethnic history.***